перад маленькім хлопчыкам? Чаму пакаранне спасцігае, па сутнасці, не героя, а яго сям'ю? Увогуле складваецца ўражанне, што ў героя апавядання ёсць рэальны прататып — чалавек або сям'я з падобным лёсам. Таму здаецца магчымым зноў вярнуцца да ідэі чорных і светлых палос у жыцці чалавека. Неверагодная ўдачлівасць героя Сачанкі — гэта вялікая светлая паласа ў яго жыцці. Але немагчыма, каб усё жыццё чалавека было адной светлай паласой, немагчыма толькі браць у Лёсу і нічога не ахвяраваць таму ўзамен. Менавіта пра гэта казаў Шылер у сваёй баладзе:

Судьба и в милостях мздоимец:
Какой, какой ее любимец
Свой век не бедственно кончал?

(Шиллер. Перстень Поликрата.)

З такога пункту гледжання фінал апавядання становіцца заканамерным. І калі ўспрыняць апавяданне Сачанкі як спробу растлумачыць гэтую з'яву, можна зрабіць яшчэ адну выснову. Светлая паласа ў жыцці заўжды замяняецца на цёмную, і чым шырэйшай была светлая, чым больш атрымлівае чалавек ад жыцця, амаль не трацячы на гэта сіл, тым страшнейшай аказваецца чорная.

**Лычагіна Т.А.,**
*суіскальнік кафедры бібліяграфіі і дакументазнаўства*

## ХВАЛІ "ЭРЫДАНА"

Да апошняга часу кнігавыданне ў Беларусі лічылася адным з лепшых у ранейшым Савецкім Саюзе. Так было і ў 1990 г., калі ўвесь адукаваны свет адзначаў 500-годдзе з дня нараджэння Ф.Скарыны, і ў 1992 г., калі Асацыяцыяй кнігавыдаўцоў быў арганізаваны конкурс "Лепшыя кнігі". Адным з лаўрэатаў названага конкурсу стала выдавецтва

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

"Юнацтва", якое прапанавала унікальную 15-томную "Бібліятэку дзіцячай літаратуры народаў СССР", зборнік "Азербайджанскія народныя казкі".

Прайшоў час, сітуацыя карэнным чынам змянілася. Так, раней у рэспубліцы дзейнічалі 10 дзяржаўных выдавецтваў. Яны займалі важнае месца ў агульнасаюзнай сістэме выпуску вучэбнай, даведачнай, мастацкай літаратуры. З усталяваннем рыначных адносін першай жа галіной, якая смела зрабіла крок у новай сітуацыі, была выдавецкая справа. Попыт пачаў вызначаць прапанову. На прылаўкі магазінаў, шапікаў хлынула літаратура, якая ў ранейшыя часы была дэфіцытам. У параўнанні з іншымі галінамі вытворчасці кнігавыданне тады ўваходзіла ў рынак апераджальнымі тэмпамі.

Аднак запоўніць рынак было б немагчыма пры існаванні адных толькі дзяржаўных выдавецтваў. Таму разнастайнасць кніжнага рынку ў асноўным забяспечвалася ў той час камерцыйнымі выдавецтвамі. Дарэчы, на сённяшні дзень ліцэнзіямі на права выдавецкай дзейнасці ў Беларусі карыстаюцца звыш 1140 арганізацый. Але не ўсе з іх займаюцца кнігавыданнем рэгулярна; значна часцей яны выдаюць адну-дзве кнігі на год. Спецыялізацыя некаторых выдавецтваў вельмі вузкая. Таму лічба 1140 нікога не павінна ўводзіць у зман. Многія фірмы палічылі патрэбным узяць ліцэнзію, паколькі кнігавыданне да пары да часу лічылася і было на самай справе адной з вельмі даходных спраў. Асноўны ўклад ва ўвесь аб'ём выпускаемай кніжнай прадукцыі рэальна давалі 10—15 прыватных выдавецтваў.

Сёння, калі сітуацыя значна ўскладнілася і хуткага прыбытку для дылетантаў у кнігавыдавецкай справе не прадбачыцца, засталіся тыя выдаўцы, якія з гэтай справай звязалі жыццё, працуюць прафесійна. Таму натуральным выглядае адыход ад гэтай сферы дзейнасці многіх прадпрымальнікаў: людзі шукаюць менш працаёмкія, больш даходныя галіны. Застаюцца такія выдаўцы, што

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

разумеюць маркетынгавыя метады вызначэння асартыменту, тыражу.

Каманда выдавецка-паліграфічнай кампаніі "Эрыдан" першай у Беларусі парушыла кнігавыдавецкую манаполію дзяржавы. "Эрыдан" быў створаны ў лютым 1989 г. спачатку як падраздзяленне літаратурна-выдавецкага агенцтва "Рэха". І было гэта, па іроніі лёсу, адразу пасля пастановы Савета Міністраў ад 30 снежня 1988 г. "Аб забароне на прыватную выдавецкую справу". Не ўдаючыся ў падрабязнасці тагачаснай складанай эканамічнай сітуацыі, можна сказаць, што ўсё адбылося, як у вядомай песні: "...как я выжил, будем знать..." Першай уласна "эрыданаўскай" была кніга А.Патупы "Фантакрим-XXI", за якую ўдалося атрымаць перадаплату ад Кнігагандлю. Гэта дало добры вынік: з'явіліся свае грошы, вера ў поспех. Карыснай была ідэя выдання малафарматных кніжак-"хвілінак" (серыя "Фантакрим-micro"). Гэта забяспечвала хуткі абарот пры мінімуме затрат часу, сродкаў. Вызначылася ўласная выдавецкая жанрава-тэматычная спецыялізацыя: фантастыка, прыгодніцкая літаратура, дэтэктывы. Ужо ў 1991 г. друкаваная прадукцыя выдавецтва "Эрыдан" была прадстаўлена ў Парыжы на І Еўрапейскім кніжным салоне.

Упершыню на тэрыторыі ранейшага Савецкага Саюза ўбачылі свет выдадзеныя "Эрыданам" томік выбраных вершаў лаўрэата Нобелеўскай прэміі І.Бродскага "Назидание", часопіс фантастыкі "Фантакрим-Мега". А эрыданаўскі г.зв. "Белый Чейз", шматтомнае выданне твораў знакамітага пісьменніка, стаў увасабленнем культурнага дэтэктыва. Усё гэта дапамагло стварыць пачатковы капітал, пачаць рэалізацыю культуралагічнай праграмы. У яе ўвайшлі зборнік пропаведзей А.Меня "Смертию смерть поправ", а таксама "Библия для детей", серыя перакладных размоўнікаў-слоўнікаў з еўрапейскіх моў. Тады выдавецтвам "Эрыдан", дарэчы, было выдадзена больш твораў беларускіх аўтараў, чым ва ўсіх прыватных выдавецтвах Беларусі разам.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Як жа ствапалася выдавецтва "Эрыдан"? Усё пачыналася з праведзенага ў паўпадвальным памяшканні семінара пісьменнікаў-фантастаў, з іх узаемадзеяння з клубамі аматараў фантастыкі ў сярэдзіне 1980-х гг. Гэта, зрэшты, у свой час выклікала відавочнае непрыманне ў чыноўнікаў ад ідэалогіі. "Эрыдан"— назва пісьменніцкай групы, у якой нарадзілася ідэя выдавецкай дзейнасці. Аднак у рэдакцыях дзяржаўных выдавецтваў тады фантастаў не любілі. Дзяржаўныя выдаўцы, і асабліва ідэолагі, бачылі ў жанры фантастыкі праяву небяспечнага свабодалюбства.

У нейкай ступені ўласныя выдавецкія праекты пачалі ажыццяўляцца з 1987 г. у цяпер ужо легендарных "парусных семёрках" (ліпеньскіх нумарах маладзёжнага часопіса "Парус"), якія з'явіліся правобразам першага айчыннага часопіса фантастыкі. Потым ён атрымаў жыццё ў 1990 г. у пробным выпуску "Фантакрима-Мега".

Сённяшняя "эрыданаўская" група — лепшыя беларускія фантасты Ю.Брайдэр, М.Чадовіч, Я.Дрозд, А.Патупа, М.Арэхаў, Г.Шышко, Б.Зяленскі, Н.Новаш, С.Булыга, С.Трусаў — зараз "аброслыя" кнігамі, прэміямі, артыкуламі-персаналіямі ў энцыклапедыях.

Каму першаму прыйшла ў галаву думка даць назву "Эрыдан" спачатку семінару, потым выдавецка-паліграфічнай кампаніі, высветліць ужо складана. Можа, у гэтым цяпер ужо няма і патрэбы. Міфалагічна-астранамічная назва прыжылася. У ёй шмат сімвалічнага, яна надзвычай дакладна характарызуе працу кампаніі, яе выдавецкае крэда.

Калі ісці ад астранамічнага паходжання назвы "Эрыдан" (г.зн. сузор'е Паўночнага паўшар'я з яркай зоркай Ахенар), тады каманду выдавецтва можна ўявіць сузор'ем аднадумцаў-прафесіяналаў на чале з генеральным дырэктарам, пісьменнікам-фантастам А.Патупам. Гэта таксама сузор'е імён аўтараў, кнігі якіх выпускае выдавецтва: Дж.Чэйз, А.Крысці, Э.Говард, К.Саймак, Р.Хайлайн, Б.Олдзіс і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Выдавецтва дзейсніла шэраг важных праектаў, у тым ліку выпуск сусветна вядомага зараз двухтомніка твораў І.Бродскага, першых у былым СССР публікацый “Звезда адмирала Колчака” пісьменніка У.Максімава, зборніка пропаведзей святара А.Меня. Асобная лінія развіцця — перыядычныя выданні. “Эрыдан” заўсёды быў, па сутнасці, кніжна-часопісна-газетнай кампаніяй, нават здымаў уласныя тэлефільмы. Шырокую вядомасць атрымаў палітыка-прававы штотыднёвік “Феміда”. Выдаваліся ўжо згаданыя першы (і пакуль адзіны) айчынны часопіс фантастыкі “Фантакрим-Мега”, часопісы “Кэмпо”, прысвечаны ўсходнім баявым адзінаборствам, і “Фантакрим-Пресс” (“Невероятный мир”), а таксама інфармацыйна-рэкламныя газеты “Восточный рынок” і “Польский рынок”. На жаль, мноства праектаў цяпер “замарожаныя”, чакаюць лепшых часоў.

“Эрыдан”— чыста беларускае выдавецтва, створанае мінскімі фантастамі без удзелу замежнага капіталу. Яно друкуе свае кнігі ў мінскіх друкарнях.

Але дзеля таго, каб кніга трапіла ў план выдавецтва, яна павінна яшчэ вытрымаць маркетынгавы аналіз. Тут высвятляюцца пытанні, ці будзе яна чытацца, ці можна будзе разлічваць на камерцыйны поспех. Аналіз спажывецкага попыту пры гэтым праводзіць аддзел маркетынгу “Эрыдана”. Магчыма, таму выдавецтва і дасягнула найвышэйшага ўзроўню спецыялізацыі па выпуску дэтэктываў, фантастыкі. Кнігі выдавецтва прыгожа зроблены, іх прыемна трымаць у руках, лёгка чытаць іх выразны шрыфт. У гэтым выяўляюцца павага да чытача, найвышэйшы прафесіяналізм. Эрыданаўскую кнігу чытаюць у метро, электрычках, студэнцкіх аўдыторыях. Яна займае пачэснае месца ў хатніх бібліятэках як добрае, з густам, любоўю падрыхтаванае выданне.

Поспех ніколі не прыходзіць сам, тым больш у такой справе, як кніжная. Поспех ствараюць людзі. Але калі паэтамі, як кажуць, нараджаюцца, то выдаўцамі стано-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вяцца. "Эрыдан" не толькі выдавецтва. Гэта і сем гадоў жыцця пісьменніка-фантаста А.Патупы, справа, якой ён служыць. Сярод пісьменнікаў-фантастаў сустракаюцца прафесійныя навукоўцы з доўгім пералікам публікацый, вучонымі ступенямі, ганаровымі званнямі, а таксама здольнасцю ствараць не толькі захапляючыя, але і пазнавальныя творы ў фантастыцы і навукова-папулярных жанрах. Імёны А.Азімава, С.Лема, Ф.Хайла, І.Яфрэмава, С.Снегава, братоў А. і Б.Стругацкіх, К.Булычова і іншых пацвярджаюць гэта. З навукі прыйшоў у літаратуру і А.Патупа, выпускнік МДУ (тэарэтычная фізіка, квантавая тэорыя), доктар навук, прафесар-вучоны, пісьменнік. У сваім творчым амплуа А.Патупа абраў два шляхі: у першым ён стваральнік навукова-мастацкіх твораў, у другім — уласна мастацкіх фантастычных. На шчасце, у абодвух выпадках яму нельга наракаць на свой пісьменніцкі лёс. Яшчэ ў 1977 г. у серыі "Эврика" выйшла яго кніга "Бег за бесконечностью", перавыдадзеная потым у Балгарыі, Венгрыі. Пазней — кніга "Открытие вселенной — прошлое, настоящее, будущее".

"Эффект Лакимена", "Эффект лягушки", "Контакт, или Несколько диалогов, подслушанных долгим зимним вечером XXI века", "Ночь на январские сементины", "Отравление", "Черная неделя Петровича"— гэтыя творы А.Патупы і шмат іншых доўгі час былі вядомыя вузкаму колу сяброў і рэдактараў. Праблемы жанру, такім чынам, А.Патупа ведае не па чутках.

Сёння ён — акадэмік Міжнароднай акадэміі інфармацыйных працэсаў, тэхналогій, Міжнароднай акадэміі лідэраў бізнесу і адміністрацыі, Нью-Йоркскай акадэміі навук; віцэ-прэзідэнт Беларускага саюза прадпрымальнікаў, член савета Беларускай канфедэрацыі прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў. На ўсё гэта, зразумела, патрэбныя час, сілы, здароўе.

А.Патупа — выдавец, аўтар, генеральны дырэктар, стваральнік суперсерыі "Фантакрим"; заснавальнік,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кіраўнік цэнтра даследаванняў будучыні пры выдавецтве "Эрыдан". Цэнтр — прыватная даследчая арганізацыя, што займаецца даследаваннямі ў галіне прагнозу, сацыялогіі. Крэда цэнтра — аб'ектыўнасць, кампетэнтнасць, адкрытасць.

У абрэвіятуры ВПК "Эрыдан" прысутнічае слова "кампанія". Чаму менавіта кампанія? Само гэтае паняцце змяшчае ў сабе перспектыву далейшага развіцця выдавецтва, жаданне аб'яднаць выдавецкую, паліграфічную базы. Аднак шматлікія цяжкасці эканамічнага характару цяпер не дазваляюць рэалізавацца такому праекту.

Сёння выдавецкая структура "Эрыдана" працуе ў рэжыме фінансава-прамысловай групы. У асяроддзі прадпрымальнікаў Беларусі даўно склалася думка, што па справах ВПК "Эрыдан" можна меркаваць аб становішчы прадпрымальніцтва ў рэспубліцы. Сёння ВПК "Эрыдан" разам з усім беларускім кнігавыданнем, усёй эканомікай краіны перажывае складаны час. А жыццё працягваецца, выдавецтва працуе, выдае кнігі, удзельнічае ў кніжных кірмашах. У чэрвені 1994 г. атрымала ўзнагароду Беларускага саюза прадпрымальнікаў за поспехі ў развіцці недзяржаўнага сектара эканомікі, падтрымку прадпрымальніцтва Рэспублікі Беларусь. У чэрвені 1995 г. выдавецтва было ўдастоена міжнароднай узнагароды "Факел Бірмінгама" за паспяховае эканамічнае выжыванне ў складаных умовах нараджэння рынachных адносін.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ